Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-08-17

# Сівая спадчына

**Напярэдадні свята пісьменства ў Глыбокім адбыліся знакавыя для даследчыкаў мінуўшчыны падзеі: у горадзе выпадкова былі знойдзены два рарытэты, якія ўражваюць сваёй каштоўнасцю і незвычайнасцю.**

**Раіса МАРЧУК,**
**фота аўтара**

11 чэрвеня побач з касцёлам Святой Тройцы, а дакладней за яго агароджай, за некалькі метраў ад плябані, работнікі электрасетак рабілі свідравіну для ўсталёўкі электрычнага слупа і натыкнуліся на старадаўні звон. Дарэчы, ён вельмі добра захаваўся. На звоне можна прачытаць надпіс на польскай мове, які па-беларуску гучыць так: “Адліваў А. Звалінскі ў Варшаве. 1882 год”.

І вось новая знаходка. 7 ліпеня работнікі глыбоцкай жыллёва-камунальнай гаспадаркі падчас дэмантажу калонкі, з якой мясцовыя жыхары бралі ваду (плануецца пракласці водаправод), выкапалі экскаватарам у самым цэнтры горада і на невялікай глыбіні каменны крыж.

— Такія крыжы, якія на тэрыторыі Беларусі пачалі з’яўляцца ў XVI стагоддзі, звычайна ставілі на хрысціянскіх могілках, — распавёў краязнаўца, настаўнік працоўнага навучання і чарчэння СШ № 2 Юрый Каўбасіч. — Многія, мабыць, і не ведаюць, што на гэтым ажыўленым месцы быў калісьці храм, а побач з ім — могілкі. Мяркую, што дасканалае даследаванне крыжа зможа даць адказ на пытанне: калі ж яны тут з’явіліся. Гэтую знаходку ўжо праз некалькі дзён убачыў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Марат Клімаў, які зрабіў замеры, фотаздымкі. Цяпер чакаем навуковае апісанне крыжа, якое дазволіць устанавіць больш дакладную дату яго ўсталявання. Мясцовыя ўлады прынялі рашэнне абазначыць гэтае месца належным хрысціянскім чынам.

Раней, падчас правядзення зямельных работ, траплялася тут шмат костак — яскравы доказ таго, што гэты крыж — надмагільны. Шмат гадоў таму пахаванні ў цэнтры Глыбокага былі парушаны. А ў не такія ўжо далёкія часы гэтую пляцоўку неаднаразова перакопвалі, калі ўзводзілі будынкі і пракладвалі камунікацыі. Знойдзеныя парэшткі былі перазахаваныя на гарадскіх могілках.

— Гэты так званы ерусалімскі крыж — чатырохбаковы, мае засечкі на кожным плячы, яго даўжыня — 1,2 метра, — дадаў Юрый Пятровіч. — На верхняй частцы — надпіс, выкананы, відавочна, кірылічным алфавітам. На жаль, якасць выканання не вельмі добрая, таму прачытаць яго змогуць толькі навукоўцы.

Спадзяемся, у гэтай гісторыі будзе працяг...

**Газета “Літаратура і мастацтва” — інфармацыйны партнёр Свята беларускага пісьменства**



*Крыж, знойдзены ў самым цэнтры Глыбокага.*

Раіса Марчук. Сівая спадчына